Год выдання 47-ы

№ 295 (13361)
СЕРАДА
18
снежня
1963 года

Цана 2 кап.

## ТРЭЦЯЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

# ПРАМОВА ДЭПУТАТА Ц. Я. КІСЯЛЁВА

**(Полацкая выбарчая акруга. Віцебская вобласць)**

Таварышы дэпутаты! Усе мы знаходзімся пад уражаннем гістарычных рашэнняў чарговага Пленума ЦК КПСС, які закончыў сваю работу. Глыбока змястоўны і пераканаўчы, эканамічна абгрунтаваны даклад М. С. Хрушчова і рашэнні Пленума выклікаюць пачуццё вялікай радасці і гонару за нашу слаўную партыю, якая ўпэўнена вядзе нашу краіну па ленінскім шляху, натхняе савецкіх людзей на новыя працоўныя подзвігі ў імя камунізма.

У дакладзе таварыша М. С. Хрушчова нарысавана захапляючая карціна далейшага развіцця савецкай эканомікі, дэталёва распрацавана праграма паскоранага развіцця хімічнай прамысловасці як важнейшай умовы ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці і росту дабрабыту народа. Рашэнні Пленума прасякнуты сапраўднымі клопатамі аб далейшым умацаванні магутнасці нашай Радзімы, клопатамі аб савецкім чалавеку. Таму наш народ так горача і аднадушна адабрае распрацаваныя партыяй меры па далейшаму ўздыму эканомікі Савецкай краіны, і ў гэтым самая трывалая гарантыя

...ранога абутку і іншай прадукцыі. За сямігодку прамысловасць дасць звыш плана прадукцыі на 3,5 мільярда рублёў.

Намечаны кантрольнымі лічбамі сямігодкі на 1965 год узровень прамысловай вытворчасці будзе дасягнуты ўжо ў 1964 годзе, г. зн. на год раней тэрміну. За апошнія 5 гадоў у развіццё народнай гаспадаркі рэспублікі ўкладзена 3,5 мільярда рублёў. Гэта значна перавышае капітальныя ўкладанні дзвюх пасляваенных пяцігодак, разам узятых. Уведзена ў дзеянне каля 200 буйных прадпрыемстваў і цэхаў, пабудавана жылля агульнай плошчай звыш 10 мільёнаў квадратных метраў, сотні школ, бальніц і іншых аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння.

У 1963 годзе нацыянальны даход рэспублікі павялічыўся ў параўнанні з 1958 годам прыкладна на 40 працэнтаў; грашовыя даходы насельніцтва—на 47,8 працэнта; аб'ём тавараабароту дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю ўзрос на 48 працэнтаў.

Бягучая сямігодка паклала па-

...за. Узрасла і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі. Павялічыліся валавыя зборы збожжа, бульбы, цукровых буракоў і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі.

З году ў год расце таварнасць сельскагаспадарчай вытворчасці. У гэтым годзе, нягледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, дзяржаве прададзена збожжа больш як 22 мільёны пудоў, у тым ліку 3 мільёны пудоў звыш плана, бульбы—980 тысяч тон і цукровых буракоў—540 тысяч тон. У параўнанні з 1958 годам мяса будзе нарыхтавана больш прыкладна ў 1,6 раза, малака—1,5 раза, яек—1,9 раза. На 10 снежня гэтага года дзяржаве прададзена 340 тысяч тон мяса, 1.244 тысячы тон малака і 191 мільён штук яек.

вытворчасці, далейшае павышэнне жыццёвага ўзроўню народа. Гэта запатрабуе ад нас смелай і рашучай ліквідацыі наяўных у рабоце недахопаў, удасканальвання кіраўніцтва, прывядзення ў дзеянне нявыкарыстаных рэзерваў, якія маюць прамысловасць, будаўніцтва і сельская гаспадарка.

У распрацоўцы і абмеркаванні праекта плана на 1964—1965 гг. прынялі шырокі ўдзел рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі прадпрыемстваў і будоўляў. Яны ўнеслі шмат карысных прапаноў па больш поўнаму выкарыстанню наяўных вытворчых магутнасцей і працоўных рэсурсаў.

Нашы магутнасці дазваляюць павялічыць тэмпы росту аб'ёму вытворчасці ў 1964 годзе ў параўнанні з сёлетнім годам мінімум да 9 працэнтаў. Аднак Дзяржплан СССР намеціў рост аб'ёму вытворчасці крыху ніжэйшы, чым планавала рэспубліка. Мы просім, каб Дзяржплан і Саўнаргас СССР разам з рэспублікай прадоўжылі пошукі дадатковага павелічэння аб'ёму вытворчасці па электратэхнічнай, лёгкай і харчовай прамысловасці.

Як ужо адзначалася, у гэтай

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ